УДК 37.035.6 (476)(091) “15/16”

**М.М. Шчэрбін,**
загадчык кафедры гісторыі і грамадазнаўчых дысцыплін
УА «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна»
(Рэспубліка Беларусь, г. Мазыр)
marina.sherbin@mail.ru.

## АДНОСІНЫ ДА РАДЗІМЫ ЯК АСНОВА ЗМЕСТУ ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ XVI–XVII стст.)

***АНАТАЦЫЯ.*** *Артыкул прысвечаны разгляду сэнсу выхавання патрыёта і грамадзяніна ў педагагічнай думкі Беларусі XVI–XVII стагоддзяў. Прааналізаваныя вядучыя грамадзянска-патрыятычныя якасці асобы на ўзроўні Радзіма-народ як неад'емная частка зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання, абгрунтавана іх узаемасувязь з этнакультурнымі асаблівасцямі беларускага этнасу. Вылучана значная роля дамінуючага светапогляду нашых продкаў, заснаванага на хрысціянскім светапоглядзе, рэлігійных і грамадска-палітычных працэсах, у выхаванні асобы патрыёта і грамадзяніна. Прадстаўлены магчымасці інтэрпрэтацыі педагагічнага вопыту нашых продкаў у сучаснай сістэме адукацыі.*

***Ключавыя словы:*** *грамадзянска-патрыятычнае выхаванне, Радзіма, родная мова, асветніцтва, нацыянальныя каштоўнасці, пераемнасць.*

**N.N. Shcherbin**
*Head of the Department of History and Social Sciences*
*UO «Mozyr State Pedagogical University named afterShchepkina. I.P. Shamyakina»*
*(Republic of Belarus, Mozyr)*
*marina.sherbin@mail.ru*

## ATTITUDES TOWARDS THE MOTHERLAND AS THE BASIS OF THE CONTENT OF CIVIC AND PATRIOTIC EDUCATION (ON THE BASIS OF PEDAGOGICAL IDEOLOGYOF BELARUS OF THE XVI–XVII CENTURIES.)

***ANNOTATION.*** *The article is devoted to considering the meaningful filling of the education of the Patriot and a citizen in the pedagogical thought of Belarus of the XVI–XVII centuries. Analyzed the leading civilian patriotic qualities of the person at the level of the homeland-people as an integral part of the content of civilian-patriotic education, their relationship is substantiated with the ethnocultural features of the Belarusian ethnos. There was a significant role of the dominant worldview of our ancestors based on the Christian worldview, religious and socio-political processes, in the education of the Patriot personality and a citizen. The possibilities of interpreting the pedagogical experience of our ancestors of the modern education system.*

***Key words:*** *civic and patriotic upbringing, Motherland, native language, enlightenment, national values, continuity.*

### Уводзіны

Аб’ектыўныя рэаліі жыццядзейнасці індывіда вызначаюць умовы выхавання, задаюць вектар руху і мэтавым, і змястоўным, і працэсуальным аспектам фарміравання асобы. Вядучую ролю ў змястоўным напаўненні грамадзянска-патрыятычнага выхавання адыгрываюць гістарычныя фактары, якія адлюстроўваюць яго карэляцыю з пэўным сацыякультурным асяроддзем і канкрэтна-гістарычнымі працэсамі. Ва ўмовах распаўсюджвання на беларускіх землях рэфармацыйных і контррэфармацыйных ідэй у канцы XVI–XVII стст. назіраюцца прагрэсіўныя зрухі светапогляднага характару адносна станаўлення чалавека, яго грамадскіх функцый, дзяржаўных абавязкаў у межах пэўнага нацыянальна-культурнага асяроддзя, што дэтэрмінавала развіццё грамадзянска-патрыятычных якасцей у дачыненні да Радзімы.

### Мэта і задачы

Мэта: вызначыць ключавыя тэндэнцыі фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы беларускіх зямель XVI–XVII стст.

Задачы: прааналізаваць вядучыя грамадзянска-патрыятычныя рысы і якасці асобы, што, на думку асветнікаў XVI–XVII стст., складаюць аснову зместу выхавання патрыёта і грамадзяніна; абгрунтаваць дэтэрмінаванасць фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання этнакультурнымі асаблівасцямі фарміравання беларускага этнасу; выявіць уплыў на развіццё зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання грамадска-палітычных працэсаў XVI–XVII стст.

### Метады і матэрыял даследавання

У артыкуле выкарыстаны наступныя метады даследавання: аналітычны, храналагічнай рэканструкцыі, крыніцазнаўчы аналіз, параўнальна-супастаўляльны.

Матэрыял даследавання: навучальная літаратура, якая адлюстроўвае думку асветнікаў XVI–XVII стст.

МГПУ им. И.П. Шамякина

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне**

Адной з вядучых асобасных якасцей у змесце выхавання патрыёта і грамадзяніна канца XVI–XVII стст. выступала імкненне да развіцця асветы і адукацыі на роднай мове. Даследуемы перыяд характарызаваўся запатрабаванасцю навучальнай літаратуры, распаўсюджванне якой прадугледжвала вырашэнне перспектыўнай задачы: годнае выхаванне маладых пакаленняў.

Л. Зізаній ажыццявіў выданне “Азбукі”, “Лексіса”, “Граматыкі славенскай” “ради любви к братьям своим”, каб у яго народа была магчымасць не толькі “… читать и без сомнений понимать книги на славянском языке и правильно писать…, в то же время украсить и просветить свой человеческий разум”, скіраваць яго на карысць свайму народу і Радзіме [1, с. 108]. Гэта садзейнічала ўдасканаленню зместу выхавання патрыёта і грамадзяніна на падставе нацыянальна-культурных здабыткаў.

З пашырэннем адукацыі на роднай мове звязваў дабрабыт народа М. Сматрыцкі. Асветнік падкрэсліваў у сваёй працы “Грамматіки славенския правильное синтагма” “всякую пользу” навучання на ўласнай мове, быў упэўнены ў роўным становішчы славянскай мовы і з грэчаскай, і з лацінскай мовамі [1, с. 111]. Мысліцель прадракаў, спадзеючыся на “божую помощь и старательное усердие” людзей, “быстрое в народе нашем возвышение  понимание, употребление и пользу славянского языка” [1, с. 111]. Дадзеныя перакананні садзейнічалі ўзмацненню выхаваўчай функцыі роднай мовы ў змесце выхавання патрыёта і грамадзяніна.

Патрыятычны характар выдавецка-асветніцкай дзейнасці настаўнікаў брацкіх школ быў накіраваны не толькі на супрацьстаянне польска-каталіцкай экспансіі, імкненне абараніць сваю веру і мову, але і на абуджэнне з іх дапамогай нацыянальнай годнасці нашых продкаў. У дадзеным працэсе навучанню на роднай мове адводзілася найважнейшая роля, што знайшло асвятленне ў змесце грамадзянска-патрыятычнага выхавання канца XVI–XVII стст.

Маштабнай асветніцкай дзейнасцю для народа адзначана жыццё С. Собаля. Яго “Букварь сиречь, начало учения детям, начинающим чтению извыкати” быў адной з першых спроб “надаць працэсу навучання дзяцей нацыянальны характар” [3, с. 114]. Асветнік падкрэсліваў неабходнасць спалучэння навучання і выхавання дзяцей з ранняга ўзросту на роднай мове. С. Собаль, прызнаючы важнасць кнігавыдавецкай справы, ініцыіраваў выпуск разнастайнай літаратуры, важнай задачай распаўсюджвання якой лічыў неабходнасць “приучить своих сограждан к чтению, самостоятельному размышлению, а также к молитве наедине” [1, с. 36]. Дадзеныя намаганні адлюстроўвалі грамадскую запатрабаванасць развіцця асветы на роднай мове.

Разам з гэтым грамадская ўстаноўка на навучанне і выхаванне моладзі ў акрэслены перыяд не прадугледжвала падаўлення асобы выхаванца. Педагогі Слуцкай гімназіі былі перакананы, што школы – гэта “мастерские человеческих душ,… где сохраняется достоинство и талант человека” [1, с. 187]. Такія паважлівыя адносіны да асобы з апорай на далучэнне яе да ведаў павінны былі абудзіць у выхаванцаў грамадзянска-патрыятычныя пачуцці, садзейнічалі ўзбагачэнню зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання канца XVI–XVII стст. перадавымі педагагічнымі ідэямі.

Наватарскімі для арганізацыі навучання і выхавання на беларускіх землях з’явіліся ідэі аўтараў Статута Слуцкай гімназіі аб спрыяльнай педагагічнай ролі “прелести и очарования местности”, дзе размяшчаецца навучальная ўстанова. Педагогі гэтай гімназіі былі ўпэўнены, што “чистота неба, плодородие почвы, богатство садов, лесов, рек, лугов…” разам з “гуманностью населения” нашага краю дапамогуць найлепшым чынам выканаць пастаўленыя мэты выхавання прыхільнасці і адданасці свайму народу і яго каштоўнасцям як важнымі грамадзянска-патрыятычнымі якасцям [1, с. 95].

Значнасць і перспектыўнасць характару аветніцкай дзейнасці на роднай мове падкрэсліваў Я.Л. Намыслоўскі. Аўтар “Нравоучения для общего пользования в жизни…” з гэтай нагоды адзначаў, звяртаючыся да сваіх вучняў, што нават, “когда я буду отсутствовать, моя работа оставалась бы постоянной памяткой и, заглядывая в нее, вы вспоминали бы о моем усердии и труде для вашего обучения” [1, с. 79]. Педагог лічыў, што “разум… неиссякаемый клад”, павінен натхняць сэрца сумленнага чалавека “…такою любовью к отчизне, что (он) безоружный готов броситься в пламя костра” [1, с. 80]. Распрацаваныя педагогам дапаможнікі накіроўвалі да фарміравання “остроты разуму”, павінны былі садзейнічаць гарманічнаму станаўленню асобы патрыёта і грамадзяніна: “способствовать усовершенствованию знаний”, “побудить к учебе”, “дать в руки оружие, чтобы укрепить убеждения” [2, с. 174]. Менавіта з асветніцтвам народа, яго навучаннем звязваў Я.Л. Намыслоўскі самаразвіццё асобы (“Не состоит ни в богатстве, ни в  мощи достоинства древо, сеет ж силу свою ум добродетелей сад”), фарміраванне адказнасці (“Кто согребает удобства себе, других ущемляя, тот добродетель и стыд не уважает совсем”), дабрачыннасці (“Украшают богатства, а добродетель счастливых рождает. Когда лишен ты богатств, доблесть обогатит”) як важных асобасных якасцей [1, с. 80, 81, 84].

Імкненнем звярнуць увагу на здабыткі свайго народа, яго традыцыі, багацце роднай мовы, падкрэсліць яе значнасць у выхаванні моладзі адзначана этнаграфічна-фальклорная дзейнасць С.Ф. Рысінскага. Мэтай выдання славянскіх прыказак і прымавак ён лічыў “воспитать в народе нравы и благочестие, пытаясь найти образцы у простых людей” [1, с. 91]. На думку паэта, прыказкі з’яўляюцца

МГПУ им. И.П. Шамякина

“…пищей, которая находится во рту у всех, касается всех и всеми пробуется”, а таму яны могуць быць выкарыстаны ў якасці даступнага сродку навучання, будуць “приятными и полезными юношеству, а также тем, кто слабо владеет народным языком” [1, с. 91]. Значны патрыятычна-педагагічны рэсурс народнай творчасці абумоўлены таксама, паводле меркавання даследчыка, тым, што з дапамогай прыказак “объясняют природу вещей, формируют нравы, получают поучительные сведения о совместной жизни людей” [2, с. 71]. Па гэтай прычыне вывучэнне прыказак дазволіць чалавеку далучыцца да ўласнай культуры, звярнуцца да вытокаў сваёй мовы і гісторыі, спасцігнуць каштоўнасці і традыцыі свайго народа, што адыгрывае ключавую ролю ў выхаванні патрыётаў.

Менавіта з дапамогай адукацыі, ведаў, далучэння да навук на роднай мове асветнікі канца XVI–XVII стст. звязвалі фарміраванне ў маладых пакаленняў актыўнай грамадзянскай пазіцыі, выхаванне адказных адносін да Радзімы, яе культуры, мовы, гісторыі як важных якасцей зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання.

Ва ўмовах актывізацыі нацыянальна-свядомасных працэсаў у канцы XVI–XVII стст. запатрабаванасць набывае адстойванне права на самастойнае развіццё народа як значная грамадзянска-патрыятычная якасць асобы ў адносінах да Радзімы.

Калі цэласнасць краіны ў даследуемы перыяд звязвалася з захаваннем дзяржаўнай незалежнасці і нацыянальна-культурнага суверэнітэту, то існаванне народа грамадска-педагагічная думка суадносіла з неабходнасцю не ўладарыць над свядомасцю, а выхоўваць норавы і “…вести (молодежь) к наукам” [2, с. 189]. Па гэтай прычыне выхаванню грамадзянска-патрыятычных якасцей адводзілася адна з ключавых роляў у фарміраванні асобы, адданай народу, карыснай грамадству і дзяржаве. Пры гэтым дадзеная акалічнасць не з’яўлялася прымусовай формай падпарадкавання чалавека грамадскім або дзяржаўным інстытутам, а выступала паказчыкам развіцця натуральнага пачуцця прыхільнасці і імкнення да агульнага дабрабыту як асновы асабістага шчасця на беларускіх землях.

У сувязі з актыўнай прапагандай асветніцтва ў канцы XVI–XVII стст. прадстаўнікі грамадска-педагагічнай думкі ўсхвалялі неабходнасць далучэння да патрабаванняў часу, “здравого разума” [2, с. 194]. Самастойнае існаванне і развіццё народа не мыслілася без належнага грамадзянска-патрыятычнага выхавання маладога пакалення, фарміравання яго актыўнай грамадзянскай пазіцыі і патрыятычнай свядомасці.

Прыкладам увасаблення гуманістычна-патрыятычных педагагічных ідэй з’яўлялася дзейнасць кальвінісцкай Слуцкай гімназіі. Статут гэтай навучальнай установы ў якасці адной з ключавых мэт сваёй працы вызначаў “воспитание достойных граждан, будущих политиков и ученых”, прыдатных сваёй Айчыне [1, с. 185]. Менавіта грамадзянска-патрыятычнае выхаванне, на думку аўтараў Слуцкага Статута, выступае найлепшым укладам у будучыню народа, бо паміж дзяржаўным клопатам пра народ і развіццём адукаванасці насельніцтва існуе прамая сувязь: падтрымка на ўзроўні дзяржавы павінна садзейнічаць асвеце народа, а дасведчаны народ будзе, адпаведна, клапаціцца пра сваю краіну. Недастатковая ўвага да адукацыі і выхавання дзяцей разглядалася педагогамі гімназіі адной з цяжкіх грамадскіх заган: “…куды вы, люди устремляетесь? Деньги копите, а между тем пренебрегаете образованием детей…” [3, с. 187]. Перспектыўны характар адукацыі маладога пакалення важны не толькі для асобаснага росту і развіцця, не толькі для задавальнення грамадскіх або дзяржаўных патрэб, але (што больш значна) для забеспячэння існавання і развіцця самога народа, меркавалі аўтары Статута.

Ва ўмовах рэлігійнай палемікі XVI – сярэдзіны XVII ст. складальнікі Статута заклікалі: ”Приходите же все, кому дорога родина, кто правильно оценивает целенаправленность своих поступков! Никому не закрыт путь! …Возраст, положение, вероисповедание не представлют для нас никакого различия” [1, с. 95]. Такая шырокая асветніцкая накіраванасць дзейнасці гімназіі на прынцыпах выхавання і адукацыі грамадзяніна, адданага Радзіме і дабрабыту народа, з’яўлялася ўвасабленнем перадавых ідэй, была накіравана на ажыццяўленне прызначэння чалавека праз яго грамадскую рэалізацыю. Гэта абумовіла суіснаванне прагрэсіўных ідэй з гуманістычнымі традыцыямі фарміравання асобы ў змесце грамадзянска-патрыятычнага выхавання канца XVI–XVII стст.

У межах канфесійнай канфрантацыі даследуемага перыяду адстойванне права на самастойнае развіццё народа разглядалася палемістамі праз захаванне сваёй ідэнтычнасці на падставе абароны ўласных традыцый і веры. Па-ранейшаму моцнымі на беларускіх землях былі погляды аб вядучай ролі рэлігіі ў годным фарміраванні чалавека, выхаванні яго лепшых рыс і якасцей. У сувязі з гэтым станаўленне асабістых якасцей патрыёта і грамадзяніна не мыслілася без чалавекалюбства і адданасці, што дапасоўваліся да рэлігійнага служэння як формы выратавання душы. Вера, на думку М. Сматрыцкага, – гэта “лечение души и тела”, пачатак самаразвіцця, важны імпульс асобаснага росту і ўдасканалення [1, с. 109].

Асабліва плённым аб’яднанне выхаваўчых магчымасцей рэлігіі і асветы народа яскрава прасочвалася ў дзейнасці праваслаўных брацкіх школ, якія выступалі свайго роду “фарпостамі нацыянальна-культурнага развіцця беларускага народа” [4, с. 34]. Пры гэтым варта адзначыць адмоўнае стаўленне дадзеных навучальных устаноў да запазычанняў у сферы адукацыі і выхаванні маладога пакалення. Спасціжэнне “веры старадаўняй” разглядалася настаўнікамі брацкіх школ галоўным сродкам



МГПУ им. И.П. Шамякина

асветніцтва народа, ключавым рэсурсам выхавання. Каардынатар Львоўскай брацкай школы мітрапаліт Арсень вызначаў галоўнай задачай сваёй навучальнай установы “доставить науку детям христианским, чтобы не отошли от своей веры, выпивая в чужих криницах воду наук языческих, после чего повсеместная гибель приближается” [4, с. 129]. Такі ахоўна-кансерватыўны погляд на адукацыю моладзі ў канцы XVI–XVII стст. быў накіраваны на абарону рэлігійнай ідэнтычнасці, уздымаў пытанні самастойнага існавання народа.

У той жа час, напрыклад, Астрожская акадэмія, імкнучыся спалучыць “усходнюю візантыйскую традыцыю з заходняй асветніцкай мадэллю”, мела на мэце праводзіць шырокую асвету народа не толькі з дапамогай “познания догматов веры”, але і з тым, каб “удовлетворить потребу в образовании молодого поколения” [5, с. 324]. З гэтай нагоды С. Косаў падкрэсліваў, што, засвойваючы розныя навукі, шкаляры “…ни в чем религии старожитной греческой не порушають”, а наадварот, дзякуючы ўсебаковай адукацыі “…потомки в отцовской вере ораторски, философски, юридически укрепленые …прославятся”, змогуць больш плённа адстойваць інтарэсы свайго народа і краіны [5, с. 312]. Дадзены перадавы падыход да выхавання прадугледжваў пошук кампрамісу з дапамогай усебаковай адукацыі народа як асновы яго існавання і развіцця.

Такое суіснаванне поглядаў адносна навучання і выхавання маладога пакалення ў канцы XVI–XVII стст. дэтэрмінавала ўзмацненне нацыянальна-каштоўнаснага вектару зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання.

**Заключэнне**

Такім чынам, калі асветнікі канца XVI–XVII стст. адстойванне права на ўласнае развіццё свайго народа дапасоўваліся да адукацыі, развіцця пісьменнасці на роднай мове, распаўсюджвання і даступнасці асветы, то палемісты, выступаючы за канфесійную самастойнасць, менавіта з ёю звязвалі этнакультурную незалежнасць як аснову існавання полікультурнага грамадства. Гэта абумовіла эвалюцыю думкі адносна зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання даследуемага перыяду, суіснавання разнастайных поглядаў і падыходаў да яго напаўнення, што было звязана як з асаблівасцямі існавання этнасу ў прасторы і часе, так і з дзяржаўна-палітычнымі рэаліямі быцця.

Развіццё асветы і адукацыі на роднай мове, адстойванне права на самастойнае развіццё свайго народа, асэнсаванне адказнасці за яго лёс як вядучыя грамадзянска-патрыятычныя якасці ў канцы XVI–XVII стст. у адносінах да Радзімы вызначаліся ростам значнасці нацыянальна-канфесійных асноў фарміравання зместу выхавання патрыёта і грамадзяніна.

На наш погляд, такі пазітыўны вопыт узмацнення нацыянальна-культурнай скіраванасці грамадзянска-патрыятычнага выхавання запатрабаваны і сучаснай адукацыйнай сістэмай і пры ўмове творчай інтэпрэтацыі будзе карысным і ў наш час.

***Бібліяграфічны спіс выкарыстанай літаратуры***

1. Антология педагогической мысли Белорусской ССР / сост.: Э.К. Дорошевич, М.С. Мятельский. – М. : Педагогика, 1986. – 468 с.

2. Гісторыя філасофскай і грамадска-педагагічнай думкі Беларусі : у 6 т. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – Т. 3: Рэфармацыя. Контррэфармацыя. Барока / аўт. тома: В.Б. Евароўскі [і інш.] ; рэдкал. тома В.Б. Евароўскі [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – 615 с.

3. История общественной и философской мысли в Беларуси: раннее и развитое Возрождение : хрестоматия : пособие / авт.-сост. В.В. Старостенко. – Могилев : УО “МГУ им. А.А. Кулешова”, 2010. – 332 с.

4. Німчук, В.В. Києво-Могилянська академія і розвиток укр. лінгвістики XVII–XIX ст. / В.В. Німчук // Роль Києво-Могилянської академії в культурному єднанні слов’янських народів. – Киев, 1988. – 312 с.

5. Памятники полемической литературы в Западной Руси. – СПб., 1882. – Кн. 2 (Русская историческая библиотека. Т. 7). – 918 с.

МГПУ им. И.П. Шамякина